Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія кадры

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 22 (208)
Панядзелак
22
лістапада
1954 г.

Цана 20 кап.

ВЫШЭЙ УЗРОВЕНЬ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

Праз паўтара месяца пачнецца зімовая экзаменацыйная сесія. Яна будзе вынікам аўтарытэтнай праверкай якасці вучэбнай работы выкладчыкаў і, перш за ўсё, праверкай самастойнай работы студэнтаў.

Сярод выпрабаваных форм універсітэцкай падрыхтоўкі да сесіі важнае месца займаюць семінарскія заняткі. На іх студэнты вучацца пераканаўча выкладаць свае веды, атрыманыя на лекцыях і асабліва пры самастойным вывучэнні літаратуры. Моладзі, якая ідзе ў навуку, прывіваецца на семінарскіх занятках цікавасць да тэорыі, уменне звязваць тэорыю з запатрабаваннямі жыцця. Іменна на семінарскіх занятках студэнты прывыкаюць думаць і выказвацца не дагматычна, а жыва, лагічна, пераканаўча.

Залішне гаварыць, якое вялікае значэнне маюць семінарскія заняткі на малодшых курсах. Некаторыя першакурснікі яшчэ не ўяўляюць сабе, у якой форме і ў якім аб'ёме яны будуць апрошаны на экзаменах. Гэтаму іх павінен навучыць семінар.

Друкуемыя сёння матэрыялы аб прайшоўшых семінарах сведчаць аб некаторых поспехах у арганізацыі семінарскіх заняткаў. Аднак ёсць сігналы і аб тым, што актыўнасць студэнтаў IV курсаў аддзялення журналістыкі і аддзялення геаграфіі значна панізілася.

Дрэнна прайшлі семінарскія заняткі па дыялектычнаму матэрыялізму на IV курсе аддзялення біялогіі. На апошнім семінары, апрача Яўгеніі Малышавай і Лены Чарняўскай, ніхто не мог змястоўна адказаць на пастаўленыя пытанні. Студэнты не сачылі за выступленнямі таварышаў, не дапаўнялі іх, а «падчытвалі» ў час заняткаў падручнікі. Студэнтка Жаўнерчык не заканспектавала работу Ф. Энгельса «Л. Фейербах і канец нямецкай класічнай філасофіі» і таму не змагла адказаць на самыя элементарныя пытанні. Многа недакладнасцей было ў выступленнях Н. Юр'евай, М. Голевай і Л. Пытляковай. Зусім адмовіліся выступаць А. Рагуская і В. Карпенка, спасылаючыся на выдуманую хваробу. Выкладчык Д. І. Шыраканаў не даў ацэнкі выступленням студэнтаў, не пацікавіўся, як яны заканспектавалі першакрыніцы.

Па сведчанню кандыдата гістарычных навук В. Г. Івашына, які вядзе заняткі на першым курсе філалагічнага факультэта, многія студэнты адказваюць завучанымі формуламі, не звязваюць асобных палажэнняў тэорыі з жыццём. Такімі бываюць выступленні Г. Башкевіч, П. Дарожніна, С. Дземідовіч.

Пасіўна прайшоў першы семінар у першай групе аддзялення беларускай мовы і літаратуры на II курсе. Некаторыя выкладчыкі (дацэнт Г. С. Маханёк, дацэнт І. С. Чымбург) не наладжваюць кантакту са студэнцкай аўдыторыяй у час лекцый, не сочаць за тым, як канспектуюцца лекцыі. Загадчыкі кафедрамі не дабіліся такога становішча, каб хоць частка студэнцкіх канспектаў праглядалася выбарачным шляхам, а выкладчыкі, якія праводзяць семінары, час-ад-часу прысутнічалі на лекцыях свайго курса ў патоку. Не сталі яшчэ сродкам папярэдняй праверкі якасці падрыхтоўкі да семінараў і кансультацыі па выкліку.

Як выкладчыкі, так і студэнты павінны адносіцца да семінарскіх заняткаў з усёй сур'ёзнасцю. Трэба дабіцца правядзення семінараў на высокім узроўні, актыўна і цікава. Семінары павінны стаць асноўнай формай папярэдняга кантролю і замацавання самастойна... даў.

ВЫТВОРЧАЯ НАРАДА СУПРАЦОЎНІКАЎ ФАКУЛЬТЭТА

Днямі адбылася вытворчая нарада навуковых супрацоўнікаў і вучэбна-дапаможнага саставу фізіка-матэматычнага факультэта.

З дакладам «Аб навукова-даследчай рабоце студэнтаў» выступіў дэкан факультэта дацэнт М. П. Халімановіч. Даклад «Аб палітыка-выхаваўчай рабоце на факультэце» зрабіў член партбюро факультэта І. І. Пятроўскі. Старшыня прафбюро мясцкома факультэта дацэнт Г. М. Міхайлаў расказаў аб рабоце лабаранцкага саставу.

Выступіўшыя ў спрэчках усебакова абмеркавалі даклады і прынялі разгорнутае рашэнне, накіраванае на паляпшэнне вучэбнай і навуковай работы.

Сустрэча з Р. Оцупам

18 лістапада адбыўся вечар сустрэчы студэнтаў нашага універсітэта з майстрам совецкага фотамастацтва тав. Оцупам П. А., які з'яўляецца аўтарам многіх фотаздымкаў па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі. П. А. Оцуп, які асабіста ведаў В. І. Леніна, выступіў перад сабраўшыміся з успамінамі аб вялікім правадыру і прадэманстраваў шматлікія фотаздымкі, апавядаючыя аб яго жыцці і дзейнасці. П. А. Оцуп дэманстраваў таксама фотаздымкі аб гістарычных падзеях грамадзянскай вайны, аб жыцці і дзейнасці І. В. Сталіна, Я. М. Свердлова, К. Е. Варашылава, М. І. Калініна, аб стварэнні слаўнай Совецкай Арміі, аб героях грамадзянскай вайны В. І. Чапаеве і Г. І. Катоўскім.

З вялікай цікавасцю прагледзелі студэнты фотаздымкі А. М. Горкага і В. В. Маякоўскага.

П. А. Оцуп адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.

В. ПАЎЛОВІЧ.

ВЕЧАР ЖУРНАЛІСТАЎ

На аддзяленні журналістыкі адбыўся вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню студэнтаў. З дакладам выступіў студэнт IV курса Я. Карпукоў.

Калектыў мастацкай самадзейнасці даў вялікі канцэрт. Затым адбыліся, танцы, літаратурная і музычная віктарыны, атракцыёны.

Актыўны ўдзел у семінарах — залог поспеху ў час сесіі

ПЕРШЫЯ СЕМІНАРЫ

Нядаўна ў нас пачаліся семінарскія заняткі па асновах марксізма-ленінізма. Першыя два заняткі прайшлі на высокім ідэйным ўзроўні, жыва і цікава. Добра і грунтоўна выступілі В. Міхалковіч, М. Сіляева, А. Радзецкая і іншыя.

Некалькі горш праходзіў трэці семінар, які быў прысвечан рабоце В. І. Леніна «Што рабіць?». Гэта часткова тлумачыцца тым, што лекцыю па гэтай тэме тав. Чымбург прачытаў нам толькі за дзень да семінара. А канспектаваць працу без лекцыйнага знаёмства з ёй у нас не хапіла ўменняў. Таму, выступаючы па першаму пытанню, Ю. Сяржанін недастаткова глыбока асвятліў яго. З асобымі заўвагамі выступалі Л. Ільіна, В. Парчэўская і іншыя студэнты. Але ва ўсіх дапаўненнях не адчувалася стройнасці і яснасці, не было паслядоўнасці ў асвятленні пытанняў.

Гэтыя недахопы мы павінны выправіць на наступных семінарскіх занятках.

Т. ЛЕБЕДЗЕВА,
студэнтка I курса аддз. біялогіі.

РЫХТАВАЦЦА ПАТРЭБНА ЛЕПШ

Першыя заняткі па асновах марксізма-ленінізма паказалі, што студэнты нашай групы добра засвоілі асноўныя палажэнні «Маніфеста Комуністычнай партыі».

—Чаму эканамічную аснову соцыяльнай рэвалюцыі складае неадпаведнасць вытворчых адносін характару прадукцыйных сіл?—звярнуўся да нас выкладчык Алег Георгіевіч.

Змястоўна, вобразна... заў на гэтае пытанне Аляксандр Падлужны. Ён заўсёды старанна рыхтуецца да семінараў, акуратна канспектуе першакрыніцы.

Нядрэнна выступілі на семінарах Эла Сабаленка і Ірына Радашкевіч.

Але ўжо на наступным семінары, які праводзіўся па кнізе В. І. Леніна «Што рабіць?», студэнты нашай групы вялі сябе вельмі пасіўна.

— З кім мы яшчэ не сустракаліся?—з мяккім гумарам пытаецца Алег Георгіевіч. Ён называе прозвішчы студэнтак Пагарэльскай і Пікулік. Але ні адна з іх не можа адказаць на пытанні выкладчыка.

На гэтым семінары многія студэнты адказвалі механічна завучанымі сказамі, іх выступленні не былі ўвязаны з сучаснасцю. Гэта з'явілася вынікам дрэннай хатняй яшчэ недастатковы... першакурснікі, паспяхова рыхтавацца да семінараў. У гэтым нам павінны дапамагчы старэйшакурснікі і, у першую чаргу, выкладчыкі сваімі кансультацыямі і вопытам.

Т. РУДНІК,
студэнт I курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

У ДРУГАКУРСНІКАЎ

Добра прайшлі семінарскія заняткі па твору В. І. Леніна «Дзіцячая хвароба «левізны» ў комунізме» ў першай групе другога курса юрыдычнага факультэта.

Актыўна выступілі на семінары выдатніца вучобы Галіна Грачова і студэнт Віктар Свірыдэнка. Іх адказы былі прадуманымі і змястоўнымі і атрымалі высокую ацэнку выкладчыка тав. Ленковай. Добра падрыхтаванымі прышлі на заняткі староста групы А. Багдановіч і комсамолец А. Разанаў. Яны заўсёды ўважліва слухаюць лекцыі, акуратна вядуць канспекты, штодзённа працуюць над творамі класікаў марксізма-ленінізма.

Аднак такія студэнты, як Кудраўцаў і Голубеў, яшчэ абыякава адносяцца да семінарскіх заняткаў. Кудраўцаў лічыць, што матэрыял яму ўжо добра вядомы і ён не жадае паўтараць «агульнавядомых палажэнняў». Студэнт Голубеў не канспектуе лекцыі па асновах марксізма-ленінізма і часта прапускае заняткі.

А. ЛАЗОЎСКАЯ.

* * *

Студэнты 3-яй групы другога курса аддзялення матэматыкі заўпараў ... прыходзіць да семінара. На апошніх заняткаў ... курснікі Цыгельскі, Сабалеўская, Ціхановіч і Ягелла выявілі глыбокае веданне твораў В. І. Леніна і І. В. Сталіна. Значна ўзрасла актыўнасць у параўнанні з першымі семінарамі.

А. ЯСКЕВІЧ.

У ФІЗІЧНАЙ ЛАБАРАТОРЫІ

Людміла Бражнік напружана глядзіць у акуляр вертыкальнага вымяральніка даўжыні. Праз аптычнае шкло бачны дзве шкалы, якія даюць магчымасць вызначыць даўжыню дробных дэталей у міліметрах і дзесятых долях міліметра.

Каб паспяхова справіцца са складанай лабараторнай работай, Людміла ўважліва прачытала інструкцыю аб карыстанні прыборам, прагледзела яго чарцяжы, паўтарыла асобныя месцы з падручніка. І таму яна ўпэўнена вызначае вышыню шкляной плоска-паралельнай плоскасці. Некалькі секунд надлікаў—і ў сшытак заносіцца першая лічба—12,6208 мм.

— Якім чынам вы даведаліся аб тысячных і дзесяцітысячных долях міліметра?—правярае Людмілу асістэнт Раіса Варфаламееўна Плашчынская.

— Па кругавой шкале. Апошні знак—на вока.

— Правільна. А цяпер вызначце вышыню гэтага стальнога бруска ў розных месцах. Калі вымяраць яго штанген-цыркулем, то ўсюды атрымаем аднолькавыя даныя. Гэты-ж прыбор дазваляе заўважыць розніцу.

І Людміла яшчэ і яшчэ прыкладваецца вокам да бліскучага акуляра. У сшытку расце калонка лічбаў. Урэшце работа скончана. Студэнтка коратка і лагічна запісвае ход даследавання. Цяпер можна памяняцца месцамі з сяброўкай Нэлай Ярашэвіч і прыступіць да вывучэння адлічальнага мікраскопа.

А Раіса Варфаламееўна пераходзіць да наступнага століка, дзе працуюць студэнты першага курса аддзялення фізікі Пётр Сазанчук і Аляксандр Клепча. Яны на прыборы Фюса вызначаюць каэфіцыент падаўжэння металічнага стрыжня. Усе даныя доследу ўжо расстаўлены ў формулы, і выкладчык гэтым вельмі задаволены.

Але не ва ўсіх студэнтаў заняткі праходзяць аднолькава пасяхова. Ліля Шахновіч не зусім ўяўляе сабе, як вызначыць цеплаёмкасць цела. Без патрэбы яна яшчэ раз ставіць каларыметр на плітку. Гэта адразу заўважвае Раіса Варфаламееўна. Яна прымушае студэнтку расказаць ход доследу і растлумачвае ёй памылку.

Канчаюцца заняткі. Аднымі з першых выканалі заданне Галіна Рэутовіч і Тамара Данілава. Яны дакладна вылічылі каэфіцыент аб'ёмнага расшырэння вадкасці. За імі дастала выкладчыка падыходзіць Людміла Бражнік.

— Добра, а галоўнае—дакладна і акуратна,—хваліць Людмілу Раіса Варфаламееўна, перагортваючы сшытак з калонкамі лічбаў.

А. МАЛЬДЗІС.

СТВАРЫЦЬ УМОВЫ ДЛЯ ПЛЁННАЙ ВУЧОБЫ СТУДЭНТАЎ--АБАВЯЗАК ПРОФСАЮЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Днямі адбылася XIV профсаюзная агульнаўніверсітэцкая канферэнцыя. З дакладам аб рабоце прафкома выступіў яго старшыня тав. Кахновіч. У спрэчках, якія разгарнуліся пасля дакладу, было ўскрыта шмат недахопаў у рабоце прафкома. Канферэнцыя прызнала работу камітэта здавальняючай і абрала новы склад прафкома ў колькасці 15 чалавек. Старшынёй прафкома абраны Д. Марчанка.

З дакладa А. КАХНОВІЧА

Профсаюзная арганізацыя універсітэта абавязана дапамагаць рэктарату, партыйнай арганізацыі выхоўваць у студэнтаў добрасумленныя адносіны да працы, дысцыпліна-ванасць, імкненне атрымаць як мага больш ведаў, неабходных для соцыялістычнага будаўніцтва. Яна павінна быць актыўным памочнікам студэнтаў у вучобе, накіроўваць іх на правільнае спалучэнне вучобы і адпачынку. Абавязак профсаюзнай арганізацыі—паўсядзённа назіраць за работай чытальнай залы, бібліятэкі, кабінетаў і лабараторый, за парадкам у аўдыторыях.

Зыходзячы з гэтых палажэнняў, прафком і будаваў сваю работу. Так, для паляпшэння дысцыпліны вучэбна-навуковая камісія прафкома праводзіла праверку наведвання лекцый студэнтамі на розных факультэтах. На яе пасяджэннях абмяркоўваліся паводзіны парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны. Да некаторых з іх прымаліся меры спагнання. Так, студэнты Ларуцін і Ляшчыніна (гістарычны факультэт) былі пазбаўлены стыпендыі, а студэнт Ясінскі (аддзяленне журналістыкі)—інтэрната.

Па хадайніцтву вучэбна-навуковай камісіі і профбюро на фізіка-матэматычным факультэце была адчынена свая чытальная зала.

Многія выдатнікі вучобы, якія актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці і мелі патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе, у гэтым семестры былі выдадзены грашовую дапамогу, а таксама пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторыі. Прафком імкнуўся дапамагчы першакурснікам у правільнай арганізацыі работы. Для гэтага наладжваліся сустрэчы студэнтаў-выдатнікаў з першакурснікамі з мэтай перадачы вопыту планавання працоўнага дня, спалучэння вучобы з грамадскай работай.

Але, нягледзячы на ўзмацненне барацьбы з парушальнікамі дысцыпліны, у нас усё яшчэ назіраюцца факты пропуску заняткаў. Ёсць таксама студэнты, у якіх дрэнная паспяховасць. Наогул, ва універсітэце ў гэтым навучальным годзе паспяховасць некалькі знізілася. Гэта тлумачыцца не толькі павышэннем патрабавальнасці да студэнтаў, але і недастатковай работай профсаюзнай і іншых арганізацый.

Вялікая ўвага ўдзялялася ў гэтым годзе навукова-даследчай рабоце, якая мае вялікае значэнне ў пашырэнні кругагляду студэнтаў, прывівае ім навыкі сур'ёзнай, творчай працы. У 65 навуковых гурткох працавала звыш 1000 студэнтаў. Да кіраўніцтва гурткамі былі прыцягнуты лепшыя навуковыя сілы універсітэта.

Прафком і яго жыллёва-бытавая камісія вялікую ўвагу ў сваёй рабоце ўдзялялі паляпшэнню жыллёвых умоў студэнтаў. Некалькі разоў праводзілася праверка хода будаўніцтва інтэрнатаў. Прафком сумесна з камітэтам ЛКСМБ арганізавалі работу студэнтаў на будоўлях, што значна паскорыла здачу ў эксплуатацыю абодвух карпусоў. Жыллёва-бытавой камісіі з'яўляецца тое, што па віне яе кіраўніка тав. Будавея многія студэнты яшчэ не атрымалі ордэры на ўсяленне ў інтэрнат. Да гэтага часу ідзе перасяленне студэнтаў з аднаго пакоя ў другі. Гэта таксама парушэнне правілаў.

Адміністрацыйна — гаспадарчая частка не заўсёды ўважліва адносілася да патрэб студэнтаў, рэагавала на іх сігналы. У новых карпусах многія кватэры яшчэ і сёння не маюць сталоў, стулляў, графінаў, чайнікаў, тумбачак, падушак і г. д. Непаваротлівасць інжынераў універсітэта прывяла да таго, што да гэтага часу не закончан рамонт аўдыторый і лабараторый на першым паверсе хімічнага корпуса.

За справаздачны перыяд праведзена значная культурна-масавая работа. Было арганізавана 15 тэматычных вечароў, 9 культпаходаў, рад творчых сустрэч з пісьменнікамі, наватарамі вытворчасці, артыстамі. Калектывамі мастацкай самадзейнасці універсітэта і факультэтаў дадзена больш 50 канцэртаў, у тым ліку большасць канцэртаў у калгасах. Тэатральны калектыў паспяхова ажыццявіў пастаноўку спектакля «Не называючы прозвішчаў» В. Мінко.

Пры актыўным удзеле прафкома ва ўніверсітэце абсталяваны радыёвузел.

Зараз у нас працуе хор, які налічвае больш 130 удзельнікаў, тэатральны, харэаграфічны, домрабалалаечны калектывы, духавы аркестр. Усім гэтым арганізацыям прафсаюзнаму камітэту патрэбна ўлічыць усе нашы недахопы, неадкладна выправіць іх і значна палепшыць профсаюзную работу.

★★★

ШЫРЫЦЬ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧУЮ РАБОТУ

(З выступлення прафесара Мышкіса)

Навукова-даследчая работа СНТ—гэта не толькі колькасць студэнцкіх навуковых гурткоў і лік членаў у іх, а і сама пастаноўка навуковай работы. У нас-жа часта да даследчай работы студэнтаў налыхолзяць фармальна. Не ўсе студэнты сур'ёзна адносяцца да распрацоўкі даручаных ім тэм, а многія выкладчыкі глядзяць на гэта як на марную трату часу.

Заахвочваць студэнтаў працаваць у гуртках СНТ—прамы абавязак і комсамольскіх і профсаюзных арганізацый. Заняткі ў навуковых гурткох карысны для кожнага студэнта. У нас нямала студэнтаў, якія ў аснову сваіх дыпломных работ паклалі даклад, зроблены некалі ў навукова-даследчым гуртку.

Новаму складу прафкома трэба ўдзяляць значна больш увагі навуковай рабоце студэнтаў. Карысна было-б устанавіць прэміі за лепшыя навуковыя работы.

БОЛЬШ УВАГІ БЫТУ СТУДЭНТАЎ

(З выступлення тав. Кавальчука)

У гэтым годзе студэнты атрымалі два новых карпусы інтэрната, Аднак у іх і па сёнешні дзень няма парадку. Не ўсе студэнты забяспечаны пасцельнымі рэчамі: некаторыя атрымалі толькі па адной прасціне, спяць без падушак. Пасцельная бялізна мяняецца нерэгулярна. Коўдры выдадзены брудныя і рваныя. У многіх пакоях няма стулляў, тумбачак, вельмі брудна на кухні.

Студэнты жадаюць паслухаць радыё, але гэта ўдаецца толькі «шчаслівчыкам», бо на два карпусы маецца ўсяго... 13 рэпрадуктараў.

Дрэнна абстаіць справа і з дастаўкай пошты. Газеты і часопісы атрымлівае далёка не кожны, хто іх выпісвае, таму што паштальён пакідае карэспандэнцыю ў вестыбюлі, дзе яе забіраюць усе, каму пажадаецца. Не раз абяцалі ў прафкоме прымацаваць да дзвярэй скрыні для пісьмаў, але гэтае абяцанне так і не было выканана.

ПАЛЕПШЫЦЬ УМОВЫ ЖЫЦЦЯ СТУДЭНТАЎ

(З выступлення тав. Майсеенкі)

Самым цяжкім і да гэтага моманту нявырашаным на юрыдычным факультэце з'яўляецца жыллёвае пытанне. Каля 500 студэнтаў факультэта жывуць на прыватных кватэрах, хоць многія з іх па зусім добра матэрыяльна забяспечаны. Для нармальнага жыцця няма ўмоў у «арэндаваных» дамах, а аб культурным забеспячэнні гэтых, з дазволу кажучы, інтэрнатаў не можа быць і размоў. Радыё тут няма, ложкі старыя, непрыгодныя для ўжывання, пасцельныя прыналежнасці поўнасцю вынашаны. Такія ўмовы жыцця, вядома, не могуць садзейнічаць нармальным заняткам студэнтаў.

Ад імя студэнтаў юрыдычнага факультэта прашу профсаюзную арганізацыю прадаставіць інтэрнат студэнтам, якія маюць у ім вострую патрэбу.

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ПАЛЯПШЭННЯ НАВУКОВАЙ РАБОТЫ

Агульнавядома, што вышэйшым прынцыпам жыцця і дзейнасці савецкай школы з'яўляецца спалучэнне навуковай і вучэбнай работы, што добра арганізаваная даследчая работа садзейнічае пераадольванню адставання тэорыі ад запросаў практыкі.

У арганізацыі навукова-даследчай работы на юрыдычным факультэце дасягнуты некаторыя поспехі. Але тут ёсць і недахопы, якія могуць і павінны быць ліквідаваны.

Асноўны недахоп, на мой погляд, заключаецца ў тым, што кафедры факультэта па-сапраўднаму не кіруюць навуковай работай як усяго калектыву, так і асобных яго членаў. Звычайна роля кафедры абмяжоўваецца толькі тым, што кафедра з пачатку года зацвярджае прапанаваныя сваімі членамі тэмы, а ў канцы года заслухоўвае інфармацыі або справаздачы аб выкананні гэтых тэм. Пры такім «кіраўніцтве» выключаецца самае неабходнае—дапамога кафедры ў працэсе работы над тэмай, калектыўнае абмеркаванне асобных пытанняў, якія даследуе аўтар, ці абмеркаванне напісаных ім раздзелаў тэмы.

Гэта прыводзіць да саматужніцтва ў навуковай рабоце. Напрыклад, двум маладым вучоным тт. Кудзінаву і Цішкевічу даручана напісаць адказныя раздзелы па гісторыі дзяржавы і права БССР. Ад своечасовага і добраякаснага напісання імі гэтых раздзелаў залежыць лёс усяго вучэбнага дапаможніка, у складанні якога ўдзельнічае вялікі калектыў выкладчыкаў факультэта. Аднак кафедры не зацікавіліся тым, з якімі цяжкасцямі сустракаюцца ўказаныя таварышы і ў якой дапамозе адчуваюць патрэбу, хоць тэрмін прадстаўлення гэтых работ набліжаецца.

Яшчэ горш абстаіць справа з апублікаваннем навуковых работ. З года ў год супрацоўнікі добрасумленна выконваюць планы, акуратна прадстаўляюць на кафедры свае працы і пахвальныя водгукі аб іх, але і працы і водгукі аказваюцца... ў архіве. Дабівацца апублікавання сваёй працы павінен чамусьці сам аўтар, нібы гэта з'яўляецца яго прыватнай справай. Але аўтарам рэдка ўдаецца «прасунуць» свой твор у друк. У выніку выкананыя работы ляжаць сярод рукапісаў, старэюць і ніякай карысці не прыносяць. Такое становішча пазбаўляе стымула да навуковай работы, а выкананне плана застаецца простай фармальнасцю. Мне здаецца, што, адобрыўшы тую ці іншую работу і рэкамендаваўшы яе да друку, кафедра павінна ўсяляк дабівацца выканання свайго рашэння. Гэта прымусіць яе ўважлівей падыходзіць да вызначэння актуальнасці тэмы, лепш кіраваць выкананнем работ, часцей ставіць справаздачы аўтараў і больш ім дапамагаць. Ад усяго гэтага выйграе якасць навуковай работы.

Вялікае месца ў арганізацыі навуковай работы павінны займаць творчыя дыскусіі па розных праблемах юрыдычнай навукі. Такія дыскусіі закліканы садзейнічаць крытыцы і самакрытыцы ў навуковай рабоце, будзіць навуковую думку, узмацняць інтарэс да навукі сярод студэнцкай моладзі. Арганізацыя публічных дыскусій на факультэце, абмеркаванне спрэчных пытанняў на пасяджэннях кафедраў тым больш неабходны, што ў некаторых студэнтаў часамі паяўляюцца лёгкія адносіны да навукі. Такім студэнтам здаецца, што ў навуцы ўсе пытанні ўжо вырашаны і што ім застаецца толькі завучыць суму гатовых формул і вывадаў, каб атрымаць права лічыцца чалавекам з вышэйшай адукацыяй.

У свой час кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права абмеркавала на сваім пасяджэнні матэрыялы дыскусіі аб утварэнні рускай цэнтралізаванай дзяржавы. На пасяджэнне прышлі ўдзельнікі студэнцкага навуковага гуртка і другія студэнты. Спрэчкі, узнікшыя на пасяджэнні па асобных пытаннях, выклікалі ў студэнтаў цікавасць да дыскусіі і жаданне прачытаць усе артыкулы, звязаныя з ёю.

Цікавае і карыснае пасяджэнне правяла нядаўна кафедра грамадзянска-прававых дысцыплін. Абмеркаваўшы судовую і арбітражную практыку, супрацоўнікі кафедры тт. Гавзе, Якаўлева, Барзова і Чыгір падрыхтавалі даклады па актуальных пытаннях грамадзянскага права. Садакладчыкамі выступілі практычныя работнікі. Гэтыя навуковыя паведамленні сабралі вялікую аўдыторыю: прышлі пракуроры, суддзі, адвакаты, юрысконсульты, якія з карысцю для сябе праслухалі даклады.

На вялікі жаль, такія навуковыя пасяджэнні праводзяцца рэдка. Тлумачыцца гэта тым, што не ўсе навуковыя работнікі займаюцца крапатлівым збіраннем матэрыялаў практыкі, вывучэннем і абагульненнем вопыта работы адміністрацыйных, судовых і пракурорскіх органаў рэспублікі. Гаворачы аб арганізацыі навуковых дыскусій, мы маем на ўвазе абмен думкамі па найбольш актуальных і мала распрацаваных пытаннях тэорыі і практыкі совецкай дзяржавы і права. А такія пытанні ставяцца самім жыццём. Рад фактаў паказвае, што ёсць неабходнасць унесці некаторыя змяненні ў сямейна-шлюбнае заканадаўства, у аўтарскае права. Чаму-б кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін не выказаць сваю думку па гэтых пытаннях, арганізаваўшы абмеркаванне іх з удзелам студэнтаў старэйшых курсаў і практычных работнікаў?

Вялікую цікавасць выклікае ў навуковых работнікаў і студэнтаў праект новага крымінальнага кодэкса, тыя спрэчныя пытанні, якія ўзніклі ў навуцы крымінальнага права ў працэсе абмеркавання гэтага праекта. Нам здаецца, што кафедра крымінальнага права магла-б арганізаваць абмен думкамі па некаторых прынцыповых пытаннях. Гэта тым больш магчыма, што за-

НАШЫ СЯБРЫ



Па запрашэнні Народнай Польшчы, якія ехалі да нас вучыцца, сустракалі так, як быццам гэта былі нашы старыя знаёмыя, лепшыя сябры дзяцінства. Сардэчная шчырасць сустрэчы дапамагла ім адразу-ж уліцца ў новую вялікую сям'ю універсітэцкага калектыву, зажыць яго шматгранным жыццём.

У спісу навуковых работ СНТ, прызнаных на гарадскім аглядзе лепшымі, мы знаходзім работы нашых польскіх сяброў Базылія Чэчугі, Стэфана Хвашчэўскага, Уладзіміра Юзвюка. Прозвішча Нікалая Тарасевіча запісана ў табліцы рэкордаў універсітэта і Гелсовета ДСТ „Навука", а песні, якія спявае на вечарах студэнцкай мастацкай самадзейнасці Вера Дронь аб польскіх комсамольцах, з цікавасцю слухаюць яе факультэцкія таварышы. Разам са сваімі аднакурснікамі студэнт філалагічнага факультэта Эдуард Гжондзеля працаваў на малатарні, калі універсітэт ездзіў дапамагаць калгасам ва ўборцы ўраджаю.

І калі з рэпрадуктараў універсітэта чуецца голас дыктара, або трансліруецца музыка, студэнты з удзячнасцю ўспамінаюць сярод імён энтузіястаў, аматараў радыётэхнікі, якія прыклалі нямала сіл для арганізацыі універсітэцкага радыёвузла, імя Стэфана Хвашчэўскага.

Дружба, замацаваная агульнай вучобай і працай, расце з дня ў дзень. Сёлета лік нашых польскіх сяброў павялічыўся. З Народнай Польшчы ў наш універсітэт прыехалі вучыцца Зося Грыц, Стэфан Стэфанюк і Ніколай Врубліеўскі.

Словы шчырай удзячнасці, якія выказала першакурсніца Зося Грыц,—гэта думкі ўсіх студэнтаў з Народнай Польшчы, якія ўліліся ў наш калектыў.

„Тыя дні, калі я прыехала ў Мінск, убачыла універсітэт і ўпершыню ўвайшла ў яго аўдыторыі, запомніліся мне, як самыя цудоўныя ў маім жыцці. Я была бясконца рада. Здзейснілася мая запаветная мара—займацца ў Совецкім Саюзе, самай перадавой краіне ў свеце. І як было прыемна, калі першая сустрэча са студэнтамі універсітэта аказалася такой сяброўскай і сардэчнай, калі таварышы-аднакурснікі са шчырым сэрцам прынялі мяне ў сваю вялікую і дружную сям'ю, акружылі пастаяннымі клопатамі і ўвагай. У гэтым цікавым калектыве я не магла засумаваць. Калі сустракаліся цяжкасці, на дапамогу заўсёды прыходзілі таварышы з групы.

Мы, польская моладзь, ад душы ўдзячны сваёй дзяржаве, партыі і ўраду за тое, што яны аказалі нам вялікае давер'е, паслаўшы вучыцца ў краіну соцыялізма. Мы ад душы ўдзячны Совецкаму Ураду, совецкім выкладчыкам і студэнтам за тое, што яны стварылі нам усе ўмовы для паспяховай вучобы і практыкі. Мы апраўдаем аказанае нам давер'е."

***На здымку**: Студэнты-палякі У. Юзвюк і С. Хвашчэўскі на занятках у кабінеце палітэканоміі.*

Фота і тэкст **І. ПЯТРОВІЧА.**

Як я працую над дыпломнай работай

Дыпломная работа—гэта вынік усёй пяцігадовай вучобы ва універсітэце, характарыстыка ведаў студэнта і яго адносін да далейшай працы. На першы погляд яна нічога складанага сабой не ўяўляе. Але, калі глыбока ўдумаўшыся, заўважаеш, што гэта вельмі адказная праца.

Тэма маёй дыпломнай работы—Мова дзеючых асоб у камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Яшчэ ў школьныя гады я вельмі зацікавіўся байкамі і драматычнымі творамі выдатнага сатырыка. Таму з першага-ж курса я пачаў старанна вывучаць творчасць К. Крапівы, вырашыўшы ў будучым прысвяціць ёй дыпломную работу.

У вывучэнні творчасці К. Крапівы мне вельмі дапамагла праца ў гуртку сучаснай беларускай мовы (кіраўнік М. І. Жыркевіч). Працуючы ў гуртку, я пазнаёміўся не толькі са зместам твораў беларускага сатырыка, але і з мовай яго баек, драм, камедый, якія вабілі мяне сваёй глыбокай ідэйнасцю, сатырычнай накіраванасцю, уменнем аўтара выражаць свае думкі вельмі сцісла, проста і захапляюча.

Выпіскі, выказванні, якія патрэбны для дыпломнай работы, я рыхтаваў яшчэ з часу заняткаў на III курсе. Я чытаў патрэбную літаратуру, складаў каталаг твораў, навуковых і крытычных артыкулаў, якія патрэбна было прачытаць і перачытаць.

Дзякуючы клопатам і парадам М. І. Жыркевіча, я на III курсе змог самастойна напісаць гуртковую работу аб мове і стылістычных асаблівасцях камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім».

Чытаючы любы мастацкі твор, літаратурна-крытычную працу або артыкул, патрэбныя для маёй работы, я выпісваў цікавыя думкі і разважанні аўтараў.

У пачатку заняткаў на V курсе я задумаўся над тэмай абранай дыпломнай работы і зразумеў, прачытаўшы і перагледзеўшы ўсё выпісанае мною раней, што гэтага вельмі мала для поўнага раскрыцця тэмы. Не трацячы марна часу, я адразу-ж узяўся за вывучэнне патрэбнай літаратуры, склаў дэталёвы план работы. Безумоўна, у працэсе далейшай працы план будзе выпраўляцца, дапаўняцца, пакуль прыме пэўна акрэслены выгляд. Цяпер я працую над дыпломнай кожны дзень па 2—3 гадзіны.

Я спадзяюся, што да 1-га лютага 1955 года буду мець дэталёва распрацаваны план дыпломнай, у чарнавыя накіды да яе, апрацаваныя і прыведзеныя ў належны выгляд выпіскі і выказванні, якія выкарыстаю ў сваёй рабоце. Мяркую застанецца толькі стылістычна апрацаваць матэрыял, скампанаваць яго і перапісаць набела. Усімі папярэднімі падрыхтаваннямі я забяспечу сабе час для падрыхтоўкі да выпускных экзаменаў.

Раю студэнтам малодшых курсаў падумаць над выбарам тэмы дыпломнай работы, актыўна ўдзельнічаць у рабоце навукова-даследчых гурткоў і распачаць падрыхтоўку матэрыялаў, выпісак да будучай дыпломнай ужо цяпер, каб не ўскладніць сваю працу і вучобу ў далейшым.

В. ГУДОВІЧ,
студэнт V курса аддз. беларускай мовы і літаратуры.

Універсітэцкі ВОЖЫК

ВЫНАХОДЦА

Студэнт фізіка-матэматычнага факультэта Ганчарэнка ўцюжыць адзежу праз прасціну або салфетку з тумбачкі.



Любая вещь подстилкой служит,
Когда штанишки он утюжит.

НЕДАРЭЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ

Ці не даводзілася вам бачыць дзенебудзь, як Івана не па яго добрай волі, а па ўласнай цемнаце і невуцтву ператвараюць у Пятра, а Пятра ў Івана? Не? А мне давялося бачыць гэтае „ператварэнне" ў кабінеце рускай і зарубежнай літаратуры. І як бы гэта не здарылася—з-за неісьменнасці мастака, ці яшчэ па якіх-небудзь прычынах,—а Нікалай Алексеевіч Некрасаў стаў ні то Ібрагімам, ні то Ігнатам, ні то Іванам. Так і красуецца ў кабінеце ўжо некалькі год партрэт Н. А. Некрасава з подпісам: „І. А. Некрасаў". І ніхто на гэта не звяртае ўвагі. Ну хай мастак зрабіў такую памылку па свайму невуцтву, але навошта-ж трымае такі надпіс да партрэта загадчык кабінета Р. Яраслаўцава?

І. ПЯТРЫЧКА

НЕВІДЗІМКІ

Лабаранткі некаторых навуковых кабінетаў часта пакідаюць свае рабочыя месцы і, сабраўшыся дзе-небудзь ва ўтульным кутку, вядуць бясконцыя размовы аб справах, вельмі далёкіх ад іх служобовых абавязкаў.

В одном кабинете,
извёвшись без дела,
Одна лаборантка,
тоскуя сидела.
Ей грустно и скучно,
как пташечке в клетке;
—Пойду, загляну
на минутку к соседке.
Вот в дальнем покое,
конспиративно,
Собравшись, подружки
толкуют интимно.
Других кабинетов
хозяйки приходят,
Любителей красного
слова находят.
Оравою в тёмном углу
заседают,
О чём-то щебечут,
о чём-то болтают.
Их ищут студенты
в великой тревоге,
Обили у всех кабинетов
пороги.

ЯГО ВЯЗАЛІ НЕ АДНОЙЧЫ

Неяк ноччу жыхары інтэрната па вуліцы Свердлова ўланкава паўскаквалі з ложкаў. Нібы бурны паток, на ніжнія паверхі ляцелі гучныя лаянкі, пагрозы і просьбы падаць што-небудзь вострае. Студэнты рушылі на чацверты паверх да пакоя № 132, у якім, мяркуючы па тэмбру ляманту, адбывалася зладзеянне. Некалькі дружных націскаў—дзверы адчыніліся, і вачам студэнтаў прадстаў п'яны вярзіла. Гэта быў аспірант Н. Каралёў, звязаны вяроўкамі.

Жыхары пакоя растлумачылі гэтую сцэну: аспірант Н. Каралёў сем разоў на тыдні бывае ў нецвярозым стане. Вечарамі-ж і ноччу яго ахоплівае манія рэзання і збівання. Для падтрымання парадку жыхары пакоя № 132 прымушаны ў такіх выпадках прывязваць хулігана да ложка.

Р. СМАЛЯК.



Когда домой приволокли—
Выделывал такие штуки,
Что очень скоро его руки
Опять оковы обрели.
(О Королёве знает каждый—
Его вязали не однажды).

Хочацца, нарэшце, застанавіцца на кандыдацкіх дысертацыях. За апошні час аспірантамі і выкладчыкамі факультэта абаронена каля дзесяці кандыдацкіх дысертацый. Але ні адна з іх, на вялікі жаль, не была надрукавана, і таму змест іх мала каму вядомы. Мы лічым, што кафедра і дэканат павінны арганізаваць азнаямленне навуковых работнікаў і студэнтаў з новымі матэрыяламі, якія аўтары дысертацый выкарысталі, і з тымі вывадамі, да якіх яны прышлі.

Маюцца і другія пытанні, якія павінны ўлічвацца пры арганізацыі навуковай работы: састаўленне навуковага раскладу заняткаў, размеркаванне грамадскіх даручэнняў, творчыя навуковыя камандзіроўкі і г. д.

Калектыў нашага факультэта, безумоўна, здолен ліквідаваць недахопы, якія перашкаджаюць плённай навуковай рабоце і паспяховаму вырашэнню тых задач, якія ставіць перад юрыдычнай навукай практыка комуністычнага будаўніцтва.

Дацэнт В. БАБІЦКІ.

гадчык кафедры крымінальнага права дацэнт т. Меркушаў меў магчымасць удзельнічаць у абмеркаванні праекта кодэкса і ўнесці свае прапановы.

Прайшоў значны час з таго моманту, як ў нашай рэспубліцы было праведзена ўзбуйненне сельскіх Советаў. Чаму-б кафедры совецкага дзяржаўнага права не вывучыць вопыт работы, асабліва арганізацыйна-масавай, ва ўзбуйненых Советах на даным этапе барацьбы за круты ўздым сельскай гаспадаркі? Такое наведамленне з цікавасцю праслухалі-б не толькі работнікі гэтай кафедры, але і ўсе выкладчыкі і студэнты нашага факультэта.

Асабліва многа важных і спрэчных пытанняў ёсць ў навуцы калгаснага права. Нездарма студэнты, вяртаючыся з вытворчай практыкі, гавораць, што найбольшыя цяжкасці яны адчуваюць, сутыкаючыся з калгасным правам. Прамы абавязак навуковых работнікаў, якія займаюцца гэтай галіной, актывізаваць сваю навуковую дзейнасць і арганізаваць абмеркаванне важнейшых пытанняў калгаснага права.

АГЛЯД ДРУКУ

Пытанні вучобы—у цэнтр увагі

Набліжаецца экзаменацыйная сесія. На ўсіх факультэтах праходзяць зараз практычныя і семінарскія заняткі, якія даюць магчымасць праверыць, як студэнты ўсвайваюць лекцыйны матэрыял, як яны рыхтуюцца да сесіі. Таму адной з асноўных задач нашага насценнага друку з'яўляецца неабходнасць дэталёвага асвятлення ходу гэтых заняткаў.

Нашы насценныя газеты па-рознаму падыходзяць да гэтага. Калі адны з іх, як, напрыклад, газета «Слова філолага», значнае месца адводзяць вучобе, то другія абыходзяць гэтае пытанне маўчаннем. Узяць хаця-б газету «За мічурынскую біялогію». За апошнія паўтара месяца газета вышла толькі два разы. Ці магла яна асвятліць усё, што адбылося на факультэце за гэты час? Вядома, не. Можа быць пагэтаму аб семінарскіх і практычных занятках яна наогул забыла.

У перадавым артыкуле першага нумару «Узняць вучэбную, навуковую і выхаваўчую работу на высокі ўзровень», у якім падводзіліся вынікі вясновай экзаменацыйнай сесіі, газета пісала: «Прафесарска-выкладчыцкаму саставу неабходна рэзка ўзняць узровень патрабаванняў да ведаў студэнтаў... Кафедры абавязаны сістэматычна кантраляваць ход прапрацоўкі студэнтамі прачытанага матэрыялу». Абвясціўшы гэтыя патрабаванні, рэдакцыя заспакоілася, вырашыўшы, што задача асвятлення вучобы ёю выканана. Аб семінарскіх і практычных занятках і ў наступным нумары не аказалася ніводнай заметкі, хаця іменна гэтыя заняткі з'яўляюцца асноўнай формай кантролю над самастойнай работай студэнтаў. Асабліва важна было-б змясціць матэрыялы аб семінарах у першакурснікаў, якім упершыню даводзіцца займацца самастойна і якім пагэтаму асабліва неабходны добрая парада і здаровая сяброўская крытыка. Замест гэтага абодва нумары газеты звяртаюцца да першакурснікаў з громкімі словамі заклікаў. «Было-б добра, калі-б вы актыўна ўключыліся ў грамадскае жыццё факультэта, таму што гэта дапамагае вучобе»,—глыбокадумна заўважае газета.

Пытанне аб паспяховасці студэнтаў, аб іх паўсядзённай вучобе павінна стаць асноўным на старонках газеты. Сістэматычна асвятляць ход семінарскіх і практычных заняткаў, паказваць вопыт лепшых студэнтаў, смела і прынцыпова выступаць супраць гультаёў і бяздзельнікаў, а не займацца філасофскімі разважаннямі—яе галоўная задача ў сучасны момант.



Пойменныя пратокі ракі Беразіна ніжэй горада Барысава.

Фота ст. выкладчыка ***Л. ВАЗНЯЧУКА.*** *(Са здымкаў, дасланых на конкурс).*

РАБОТЫ ХІМІКАЎ

На мінулы гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ гурткоўцы-хімікі прадставілі 13 эксперыментальных і адно рэфератыўнае даследаванне. 12 з гэтых даследаванняў былі аднесены да першай катэгорыі, астатнія—да другой. Сярод лепшых работ вызначаюцца работы студэнта IV курса Л. Кавалёва «Кінетыка эмульсіённага аўтаакіслення ізапрапілбензола» і студэнткі IV курса Л. Гурэвіч «Акісленне цыклагексанілэтанона».

У гэтым годзе на факультэце будзе працаваць 5 навуковых гурткоў, у якіх будуць займацца 80 студэнтаў.

Актыўна ўключыліся ў работу гурткоў першакурснікі. Большасць іх працуе ў гуртку неарганічнай хіміі і рыхтуе рэфератыўныя даклады. Так, студэнтка І. Кірычэнка распрацоўвае даклад на тэму «Развіццё вучэння аб хімічнай валентнасці», студэнтка Л. Кільчэўская працуе над дакладам «Карозія металаў».

П. УЛАДЗІМІРАЎ.

ПАСЯДЖЭННЕ МАТЭМАТЫЧНАГА СЕМІНАРА

Нядаўна ў вялікай фізічнай аўдыторыі універсітэта адбылося чарговае пасяджэнне агульнагарадскога матэматычнага семінара.

Сабраўшыяся заслухалі і абмеркавалі даклады кандыдата фізіка-матэматычных навук А. М. Камісарука «Аб сетках, дапускаючых вярчэнне» і выкладчыка Л. Н. Рынкіна «Аб тыпах цэлых функцый двух комплексных перамен».

П. ПЯТРОЎ.

У СТУДЭНЦКІХ НАВУКОВЫХ ГУРТКАХ

Добра працуюць на юрыдычным факультэце гурткі студэнцкага навуковага таварыства: асноў марксізма-ленінізма, палітэканоміі, крымінальнага права, грамадзянскага права, крымінальнага працэсу і іншыя. У іх займаецца да 200 студэнтаў. Тэматыка студэнцкіх работ цесна звязана з навукова-даследчай работай кафедраў, з актуальнымі пытаннямі нашых дзён.

Цікавую работу «Вераснёўскі Пленум ЦК КПСС аб магчымасцях і перспектывах далейшага развіцця сацыялістычнай сельскай гаспадаркі» выканаў у мінулым навучальным годзе студэнт В. Бузак. З дакладам «Аграрная рэформа ў народным Кітаі і яе значэнне» выступіў студэнт І. Платонаў на пасяджэнні гуртка асноў марксізма-ленінізма.

Многія работы ствараюцца непасрэдна на матэрыялах практыкі. Напрыклад, група студэнтаў III курса выязджала ў МТС рэспублікі для вывучэння законадаўства аб працы. На сабраных матэрыялах імі былі выкананы цікавыя работы. Вялікую цікавасць выклікаў даклад студэнта В. Куранкова на тэму: «Аплата працы ў МТС», які быў прачытаны на агульнафакультэцкай студэнцкай навуковай канферэнцыі.

Студэнты ў сваіх работах часта выкарыстоўваюць і абагульняюць вынікі работы Вярхоўнага суда БССР, народных судоў рэспублікі.

Значную ўвагу дзейнасці студэнцкіх навуковых гурткоў аказваюць дацэнты Г. А. Левін, Н. А. Меркушаў, С. П. Рагожын, старшы выкладчык Леанкова.

З першых дзён новага навучальнага года студэнты нашага факультэта ўключыліся ў навукова-даследчую работу. Ужо адбыліся першыя пасяджэнні гурткоў асноў марксізма-ленінізма, крымінальнага права і іншых. На пасяджэнні гуртка крымінальнага права быў абмеркаван даклад студэнта III курса Курдзюкова «Адказнасць за ўкрывацельства ў совецкім крымінальным праве».

А. КАЗЛОЎСКІ,
старшыня совета СНТ юрыдычнага факультэта.

ЦІКАВЫ ДАКЛАД

На біёлага-глебавым факультэце адбылося пасяджэнне гуртка мікрабіялогіі, на якім студэнтка V курса Н. Сабіла прачытала даклад на тэму: «Гладкія і складчатыя формы бактэрый».

Члены гуртка ўсебакова абмеркавалі гэты цікавы даклад.

На чарговым пасяджэнні гуртка будзе заслухан даклад студэнткі V курса Н. Жалезнай «Роля мікраарганізмаў у жыўленні раслін».

Красворд

(Адказ на красворд, надрукаваны ў мінулым нумары нашай газеты)

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:

1. Стасаў. 3. Карбід. 6. Варна. 8. Эмбарго. 9. Метылен. 10. Ласка. 11. Артэк. 13. Ротар. 15. Атрыбут. 17. Вораг. 18. Рэнта. 19. Рэформа. 20. Лакмэ. 21. Косць. 22. Герадот. 23. Цынга. 24. Афера. 25. Транзіт. 28. Бялок. 30. Парад. 32. Метад. 33. Лагойск. 34. Ударнік. 35. Анонс. 36. Данбас. 37. Контур.

ПА ВЕРТЫКАЛІ:

1. Сцэна. 2. Абрэк. 4. Актор. 5. Донар. 6. Волат. 7. Амаду. 12. Рэволюцыя. 14. Амальгама. 15. Агрэгат. 26. Рамка. 27. Індус. 28. Балід. 29. Кайма. 30. Плато. 31. Докер.

АЛКАГОЛЬ—ВОРАГ ЗДАРОЎЯ

Алкаголь прыносіць арганізму чалавека вялікую шкоду. Калі гэта не заўсёды адразу адчуваецца, дык толькі таму, што арганізм чалавека здольны змагацца супроць дзеянняў алкаголю.

Пры першым ужыванні алкаголю ў чалавека пачынае раздражацца нюх, смакавыя адчуванні, выклікаюцца агіда, непрыемная пякота і, як абараняльны рэфлекс, рвота. Калі доза алкаголю невялікая, то страўнік адказвае на алкагольнае раздражэнне багатай залозістай сакрэцыяй, якая не толькі растварае, але і нейтралізуе алкаголь.

Прыняты ў вялікай дозе, алкаголь усвайваецца ў страўніку і хутка паступае ў печань, а затым і ў кроў. Трапляючы ў сасудзісты ход, алкаголь у першую чаргу парушае функцыі важнейшага органа чалавека—галаўнога мозгу, выклікаючы тым самым парушэнне нармальнага руху (хісткая паходка). Як усякі яд, алкаголь нават у малых дозах выклікае раздражэнне нервовых клетак, а часам канчаткова паралізуе іх функцыі. У выніку гэтага ўзнікае псіхічны стан: чалавек становіцца самадавольным, словаахвочым. У стане алкагольнага ўзбуджэння ў чалавека паяўляюцца розныя імкненні, аднак яны, як правіла, нерэальныя, фантастычныя. Пры вялікіх дозах алкаголю арганізм рэагуе агульнымі спазмамі мазгавых сасудаў, якія ахоўваюць вышэйшую сферу мышлення—галаўны мозг.

Самаахоўны рэфлекс мозгу, як паказаў найвялікшы фізіёлаг акадэмік І. П. Паўлаў, адказваючы на атрутнае дзеянне алкаголю ахоўваючым тармажэннем, абараняе мозг ад паражэння. Пасля сну, на працягу якога з арганізма чалавека выдзяляецца алкаголь, чалавек становіцца цвярозым. У некаторых людзей у залежнасці ад дозы алкаголю і стану арганізма алкаголь затрымліваецца ад 12 да 24 гадзін і нават больш. Бываюць выпадкі, калі прынятая доза алкаголю аказваецца настолькі дзейснай, што ні натуральныя ахоўныя рэфлексы, ні сон не выратоўваюць чалавека. Алкаголь пашкоджвае мозг, і п'яны траціць прытомнасць, а калі згасаюць жыццёвыя рэакцыі, у тым ліку сардэчная дзейнасць, а з ёю і функцыя дыхання—чалавек гіне.

Пры частым ужыванні алкаголю ў невялікіх дозах засцерагальныя механізмы чалавека паспяваюць прыстасавацца і нейтралізаваць алкаголь. Але, калі чалавек часта ўжывае яго, то для спецыфічнага алкагольнага адчування яму патрабуецца ўсё большая і большая доза алкаголю. І хоць сістэматычнае ўжыванне алкаголю ў такіх людзей не выклікае значнага ап'яняючага эфекту, усёроўна гэта прыносіць вялікую шкоду арганізму.

Сістэматычнае раздражэнне алкаголем стрававальных органаў прыводзіць да змены функцыі стрававальных органаў, да змены функцыі і будовы слізістай абалонкі рота і ўсяго страўніка-кішэчнага тракта. Развіваюцца катаральныя працэсы міндалін, гартані, голас становіцца хрыплым, паяўляецца катар страўніка і кішэчніка, паражаецца печань. Пячоначныя клеткі набухаюць, пераражаюцца, у іх адкладваецца тлушч. Потым пячоначныя клеткі зусім гінуць. Гэтае захворванне называецца цірозам печані. Алкаголь, пранікшы ў кроў, паражае крывяносныя сасуды і мышцу сэрца. Хворыя пачынаюць стамляцца, паяўляецца задышка, а затым поўнае расстройства кровезвароту, што прыводзіць чалавека да смерці.

Сур'ёзныя парушэнні выклікае алкаголь у нервовай сістэме арганізма. У алкаголікаў развіваецца натлівасць, дрыжэнне пальцаў на руках, сударагі, расстройства і страта адчувальнасці.

Алкаголь паражае галаўны мозг, у алкаголікаў аслабляецца памяць, рассейваецца ўвага, губляецца працаздольнасць, з'яўляецца схільнасць да амаральных учынкаў. У алкаголікаў вясёлы настрой вельмі хутка змяняецца станам суму, меланхалічным смехам, плачам, балбатлівасцю і г. д.

Страта сілы волі, жаданне падтрымаць стан ап'янення прыводзіць алкаголіка да запою. Прыпадкі запою пачынаюцца ў перыяд упадку настрою і бяссонніцы.

Працяглае злоўжыванне алкаголем нярэдка выклікае такую страшэнную хваробу, як белая гарачка. У хворага зацямняецца свядомасць, ён не пазнае знаёмых і свайго месцазнаходжання, з'яўляюцца зрокавыя і слухавыя галюцынацыі... Хворым здаецца, што на іх рухаюцца жудасныя стварэнні. У такія моманты хворы стараецца ўцячы: ён выскаквае праз акно, кідаецца ў раку, канчае жыццё самагубствам. На працягу ўсяго перыяду белай гарачкі хворыя не спяць. Гарачка цягнецца некалькі дзён і можа скончыцца выздараўленнем ці смерцю.

Важным сродкам лячэння алкагалізма з'яўляецца фізкультура і спорт, а таксама працатэрапія, гэта значыць такая арганізацыя працы і адпачынку, якая-б адцягвала хворага ад жадання выпіць. Супроць разбуральнага дзеяння алкаголю на нервовую і сасудзістую сістэму, а таксама печань і іншыя ўнутраныя органы, акрамя спынення ўжывання алкаголю, вельмі важнае значэнне мае прыём хворымі вялікай колькасці вітаміна «С».

Урач О. ВАЙЦЭХОВІЧ.

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 10328 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыр. 1000 Зак. 741